УДК 94(476.1-25)«15/16»



**Аляксандр ДОЎНАР**
*Загадчык аддзела гісторыі Беларусі IX—XVIII стст. і археаграфіі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Сфера навуковых інтарэсаў: эканамічнае, сацыяльнае развіццё Беларусі часоў Вялікага Княства Літоўскага, гарадское і сельскае самакіраванне XV—XVIII стст. Аўтар больш за 100 навуковых прац.*



**Надзея ПАЛТАРЖЫЦКАЯ**
*Старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX—XVIII стст. і археаграфіі, кандыдат гістарычных навук. Сфера навуковых інтарэсаў: гарадское самакіраванне XV—XVIII стст., гісторыя Мінска, актавыя кнігі гарадскога самакіравання, археаграфія. Аўтар больш за 20 навуковых прац.*

# Гістарычная тапаніміка МІНСКА *ў крыніцах XVI—XVII стст.*

**Гісторыі Мінска прысвечана шмат даследаванняў, якія падсумаваны ў грунтоўных выданнях [1—7]. Разам з тым навуковая праца працягваецца, бо значная частка з'яў і падзей з гісторыі сталіцы патрабуе ўдакладнення на аснове ўвядзення ў навуковы зварот раней невядомых ці не выкарыстаных да гэтага часу архіўных крыніц. Напрыклад, бачыцца мэтазгодным дапоўніць і дэталізаваць гістарычную тапаграфію і планіровачную структуру Мінска.**

**Ключавыя словы**: *Мінск, XVI—XVII стст., актавыя кнігі, урбанонімы, вуліцы, аб'екты гарадкой забудовы*

Вядома, што пад час правядзення валочнай памеры ў XVI ст. у горадзе была закладзена планіроўка па вуліцах і пляцах, якая захоўвалася некалькі стагоддзяў. Але паўстае пытанне: што было да валочнай памеры? Аказваецца, сітуацыя нават з назвамі аб'ектаў нерухомай маёмасці была крыху іншай, чым прынята лічыць. Так, у лісце мінскага мешчаніна Радзькі Філіпавіча Рыліновіча ад 16 студзеня 1542 г. на продаж каморы на рынку мешчаніну Акуле Арцёмавічу Пішчалку зямля, на якой знаходзілася камора, называецца не пляцам, як гэта было прынята пасля валочнай памеры, а *"местом"* [8, арк. 25].

*Фрагмент экспазіцыі Археалагічнага музея.*





*Ліст мінскага мешчаніна Радзькі Рыліновіча на продаж каморы на рынку мешчаніну Акулу Пішчалку з гарадской пячаткай. 16 студзеня 1542 г.*[1]

"Я Радко Филипов, сын Рылиновича, вызнаваю тым моим листом кождому | доброму, кому будет потреб(а) тог(о) ведати и, чтучи ег(о), слышати н(ы)неш|ним и на потом будучим, што ж продал есми комору сваю властную | отчизную, што мел поспол з дядком з Василем Рылком и з местом на рынку | ов межу сумесь коморою Федка долгого а об другу сторону обмежу | коморою Масленчиною Окуле Ортемовичу Пищелце за пят коп | гр(ошей) литовское манеты обел вечне и неподвижне, ему самому и ег(о) | жоне и детем их.

Волен Окула тую комору з местом от мене ему про|даную продати и променити и ког(о) хотячи подаровати и к пожи|точному доброму своему обернути, на што валя его будет.

А мне, | Радку Филиповичу и моеи жоне и детем моим и братаничу моему / Ондрею и близким н(а)шим и на потом будучим счадком их в тую комору / от мене Ему проданую непотреб(е) никому уступати; а пакли бы | хто з нас мел в тую комору уступатис, таковыи мает первеи | ниж ку праву уступуючи в ратуш вины десят гривен заплатити. /

А при том были и тог(о) добре сведоми люди добрыи: лавник Еким Сидо|рович, Грин Маневич, Богдан Верещака, Иван Шварстович, Остап | Иванович кравец.

А для лепшог(о) сведомя твердости просили Есмо п(а)на | воита и п(а)нов бурмистров, рядец о печат, абы приложили. И их м(и)л(о)сть, на | прозбу и чоломбите н(а)шо вчинили, печат местцкую приложили к сему | моему листу.

Писал местцкии дьяк Семен.

П(и)сан в Менску, под лет(а) | Бож(его) нарож(енья) 1542 м(еся)ца дек(абря) 4 д(е)нь, индикта 1".| [2]

Крыніца: Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. — Ф. 822. Воп. 11. Спр. 884 Г. Арк. 25.

---

[1] Прынцыпы перадачы тэксту наступныя: прапушчаныя літары ў скарочаных словах бяруцца ў круглыя дужкі "()"; літары, якія напісаны над радком, набраны курсівам; літары, якія выйшлі з ужытку, замененыя сучаснымі; падкрэсленне перададзена; знакі прыпынку расстаўленыя ў адпаведнасці з сучаснымі правіламі пунктуацыі; канец радка адзначаецца вертыкальнай лініяй.

[2] Далей на сярэдзіне ліста гарадская пячатка Мінска.

На сённяшні дзень можна з упэўненасцю сцвярджаць, што добра даследавана гарадская тапаніміка сталіцы за перыяд з канца XVIII ст. [9—16]. Аднак назвы вуліц XV—XVIII стст., гісторыя іх узнікнення і месцазнаходжанне вывучаны недастаткова. Напрыклад, першапачатковая назва вуліцы Зыбіцкай, па ўсёй верагоднасці, была Зазыбіцкая [17, арк. 112, 126, 126 адв., 127 адв., 150, 179, 179 адв., 274 адв., 301 і інш.]. У дакументах другой паловы XVII ст. ужываецца толькі гэтая назва, а таксама ёсць цікавая дапіска пазнейшага часу да старой назвы "Зазыбіцкая" іншымі чарнілами і почыркам (меркавана XVIII ст.) слова "Зыбіцкая" [18, арк. 1044].

Звесткі аб вуліцах на Траецкай гары (у вуснай традыцыі XIX — пачатку XX ст. — Траецкае прадмесце) з захаваных мінскіх магістрацкіх кніг другой паловы XVII—XVIII ст. з'яўляюцца важнымі для вывучэння забудовы [19]. Старажытная планіроўка Траецкай гары практычна ўся была страчаная, асабліва цэнтральная і паўночная часткі, у час пажару летам 1809 г. Па гэтай

прычыне назвы большасці вуліц, якія былі тут да гэтага часу, вядомыя толькі па дакументах XVI—XVIII стст. Так, у кнізе актаў мінскага магістрата ў 1679 г. сустракаюцца звесткі аб вуліцах Забярэжнай [18, арк. 992 адв., 993 адв.], Віленскай [17, арк. 888—889 адв.], Вялікай Магілёўскай [17, арк. 739, 742], Траецкай [17, арк. 556, 557 адв.; 18, арк. арк. 974, 976 адв.], Барысаўскай [10, с. 215].

Царква Барыса і Глеба дала назву вуліцы і вулачцы на Траецкай гары пад назвай Глебабарысаўская, якая таксама згадваецца ў адзначаны перыяд [17, арк. 402 адв.]. Вулачка Глеба і Барыса (альбо яшчэ ў дакументах — вулачка да царквішча Глеба і Барыса) згадваецца ў запісе аб продажы ў 1679 г. мечніку Яну Шырановічу пляца, які знаходзіўся *“на рагу насупраць крамак на Траецкай гары, з аднаго боку ідучы з вуліцы Віленскай да царквы Святой Тройцы па леваму боку, а з другога — вулачкі Глеба і Барыса насупраць крамкі на Траецкай гары, тылам да пляца пані Бабурчынай, на якім пражывае пан Раман Андрэевіч”* [18, арк. 1016, 1112—1113 адв.]. Тым не менш з-за малой колькасці звестак нельга з упэўненасцю сказаць, што гэта былі два асобныя аб’екты.

Важнымі з’яўляюцца і згадкі вуліц, якія знаходзіліся ў Татарскім канцы. З іх асаблівую цікавасць уяўляе вуліца Гарашынская (у дакуменце Horoszynska, Haraszynska), згадак аб якой няма ў даследаваннях тапанімікі Мінска за пазнейшы перыяд. Яна згадваецца ў Татарскім канцы *“ідучы ад царквы Святога Міколы па праваму боку паміж пляцамі татар Асана і Вароновіча ў ратушнай юрыдыцы”* [17, арк. 854, 854 адв.]. Больш падрабязнае яе месцазнаходжанне ўказана ў рэестры з пералікам пляцаў, ніў і сенажацяў татарскага ротмістра Самуэля Сулейманавіча Зяцкевіча на тэрыторыі ратушнай юрыдыкі ў Мінску [17, арк. 361 адв.].

Сярод іншых малавядомых вуліц Мінска згадваецца вуліца Макавая, якая таксама значыцца ў рэестры татарскага ротмістра на тэрыторыі ратушнай юрыдыкі *“з аднаго боку каля пляца пана Яна Філіповіча, а з другога — пляца Валковічаў, канцом да пляца святара Васкрасенскай царквы”* [17, арк. 361 адв.; 18, арк. 891]. На жаль, згадкі пра асобныя ўрбанонімы адзінкавыя, таму ўдакладніць іх месцазнаходжанне пакуль што складана. Гэта датычыцца вуліцы Захарышынскай (у дакуменце — Zacharyszynska), якая паводле запісу за 1667 г. знаходзілася *“недалёка ад горада за гумном братоў Суліманавічаў, каля трох ніў Філіповічаўскіх”* [17, арк. 362, 483 адв.], вуліцы Просцьма, што праліягала *“з аднаго боку каля пляцаў семінарыі, а другога — Васіля Маскаля, тылам да пляца бурмістра Фурса Яна Уласовіча”* [17, арк. 447] у 1668 г.




*Менск. Гравюра 1770-х гг. Крыніца: Вялікі гістарычны атлас Беларусі. Т. 2. Мінск: Белкартаграфія, 2018. С. 50.*

У сваю чаргу, дакладную лакалізацыю невялікіх вулачак тагачаснага горада, якія таксама з’яўляюцца цікавым аб’ектам даследавання, вызначыць у большасці выпадкаў складана. Толькі некаторыя з іх маюць назву і ўказваюцца ў дакументах, што дазваляе ўстанавіць іх прыблізнае месцазнаходжанне. Так, згадваецца вулачка, якая *“ідзе ад царквы Святога Юрыя на Нямізе”* [17, арк. 753—754; 920—921], альбо *“вулачка з Нямігі”* [17, арк. 10—15 адв.]. Шэраг назваў вулачак на Траецкай гары сустракаецца ў адзінкавых дакументах. Так, вулачка Бурнеўская знаходзілася *“з аднаго боку каля вулачкі, якая ідзе ад Віленскага гасцінца да ракі Свіслач, а з другога — пляца Аляксея Самовіча, тылам да пляца пані Пашкевічавай, на якім пражывае Кійко, каля берага Свіслачы за дарогай са Слабады да Мінска”* ў 1674 г. [17, арк. 849 адв.].




*План горада Менска. Канец XVIII ст.*
*Крыніца: Вялікі гістарычны атлас Беларусі. Т. 2. Мінск: Белкартаграфія. 2018. С. 51.*

На Траецкай гары, ідучы са Старога рынка ад моста па левым баку можна было патрапіць і на вулачку Шубскую, якая знаходзілася *"да Свіслачы ідучы да Старосцінскай Слабодкі, з аднаго боку каля пляца пана Іваноўскага, а з другога — пляца Астапавічскага, брамамі да вуліцы, тылам да пляца Мікалая Скрагі і аршанскага старосты Крышпіна, ідучы вулачкай да царквы Барыса і Глеба"* [18, арк. 932—933 адв.].

Цікавасць уяўляе той факт, што шэраг вулачак на Траецкай гары часам меў назвы, якія адпавядалі імені ці прозвішчу ўладальнікаў нерухомай маёмасці. Так, на Траецкай гары згадваецца *"вулачка пана Геліяша Шчытніковіча"* [18, арк. 1020, 1021, 1021 адв.]. У другім выпадку ў лісце пані Фядоры Акулінай пазначана аб перадачы пану Лукашу Чараповічу крамнага пляца ў саляным радзе і паловы пляца на Траецкай гары

Што датычыць абарончых збудаванняў Мінска, мы добра ведаем пра іх наяўнасць, але як яны выглядалі, невядома. Так, у вышэйапісаных матэрыялах часта згадваюцца абарончыя валы вакол горада. У сярэдзіне XVII ст. Мінск з паўднёвага і паўднёва-заходняга боку быў абнесены новымі гарадскімі ўмацаваннямі ў выглядзе земляных валоў з равелінамі, бастыёнамі і брамамі [1, с. 151]. Можна меркаваць, што як мінімум адна брама *"на вуліцы Юраўскай на тракце Ракаўскім"*, г. зн. Юраўская, была мураванай (яна згадана як "старая" ў 1742 г.) [21, арк. 149 адв.]*. У дакуменце за 1728 г. Юраўская брама на Ракаўскім гасцінцы называлася "Татарскай" [20, арк. 275]**. Крыніцазнаўчы пошук адносна XVIII ст. дазволіў пацвердзіць наяўнасць у Мінску абарончых умацаванняў і ўстанавіць факт існавання ў другой палове XVIII ст. чатырох гарадскіх брам: Юр'еўскай, Койданаўскай, Лошыцкай (Францысканскай) і раней невядомай у адзначаны перыяд Барысаўскай [22, арк. 31 адв. — 32]. Разам з гэтым патрабуюць дэталёвага вывучэння таксама і аб'екты гарадской забудовы Мінска ў адзначаны перыяд: рынкі, масты, млыны, бровары, цагельні, дарогі і інш. [23; 24], а таксама рэкі, урочышчы і сенажаці, блізкія вёскі і фальваркі, што з цягам часу ўвайшлі ў тэрыторыю горада.

* У дакументах 40-х гадоў XVIII ст. дадзеная брама апісваецца як "старая мураваная". Прыметнік "старая" сведчыць, што яна была ўзведзена мінімум за 30 гадоў да адзначанай згадкі. Аднак ні ў другой палове XVII ст., ні ў пачатку XVIII ст. горад не меў неабходных матэрыяльных і грашовых рэсурсаў для правядзення мураванага будаўніцтва. Гэта ўскосна сведчыць пра тое, што мураваная брама была ўзведзена ў сярэдзіне XVII ст. пры будаўніцтве новых гарадскіх умацаванняў.

** Аўтары дзякуюць У.І.Пашкевічу за прадастаўленую інфармацыю.

*"на вуліцы, празванай "Акулінай"* [17, арк. 235]. У іншым дакуменце згадваецца пляц на Траецкай гары *"ад вулачкі Акулінскай па праваму боку ідучы на дол да ракі"* [17, арк. 900—902 адв.]. У мінскіх магістрацкіх кнігах за першую трэць XVIII ст. вуліца Акулінская згадваецца двойчы [20, арк. 84, 269 адв.].

Акулінскі пляц на Траецкай гары побач з вулачкай Кесіноўскай указаны ў запісе аб продажы пану Лаўрэну Багданавічу пляца Пятрусаўшчынскага *"з аднаго боку каля пляца таксама Пятрусаўшчынскага, які быў прададзены пану Яну Бярнацкаму, а з другога — Акулінскага, які трымае Лукаш Чарапавіч, насупраць вулачкі Кесіноўскай, тылам да пляцаў,* [якія] *вядуць да вуліцы Віленскай"*. Магчыма, назва Акулінскай вулачкі пайшла ад прозвішча ці мянушкі яе ўладальніка. Наогул, такія назвы вулачак у тагачасным Мінску, як Алісевічаўская, Бабурчынская толькі пацвярджаюць гэтае меркаванне.

Усе адзначаныя вышэй вуліцы, якія фарміраваліся ў ранейшы перыяд, застаюцца на планах губернскага Мінска (але пад іншымі назвамі) да частковага знішчэння іх забудовы ў 1940—1970-я гг. У сваю чаргу, дакладную лакалізацыю невялікіх вулачак горада, якія таксама з'яўляюцца цікавым аб'ектам даследавання, вызначыць у большасці выпадкаў складана. Толькі некаторыя з іх маюць назву і ўказваюцца ў дакументах, што дазваляе ўстанавіць іх прыблізнае месцазнаходжанне.

Важным этапам у даследаванні дакументаў мінскіх магістрацкіх кніг з'яўляецца крытычны аналіз іх тэкстаў. Найперш гэта датычыцца выяўлення фальшывых аркушаў, якія масава ўстаўляліся ў актавыя кнігі ў першай палове XIX ст., а таксама вызначэння памылак розных пісараў у напісанні ўрбанонімаў. Справа ў тым, што звесткі аб месцазнаходжанні нерухомай маёмасці запісваліся са слоў мінскіх мяшчан, таму назвы некаторых вуліц запісаныя адвольна. Напрыклад, ужываюцца такія вызначэнні вуліц, як "Яўрэйская", "Чарнецкая", "Бурмістроўская", якія відавочна мелі іншыя назвы, але былі зразумелымі для жыхароў горада ў гэты перыяд. Акрамя гэтага, часта ўжываюцца знакавыя арыенціры для таго часу: *"Дарожка, па якой кароль Уладзіслаў ездзіў на Смаленск"*, *"Ідучы да Трасцянца і да бортнай сасны"*, *"Дарога зімовая на Заслаўль"* і інш. Гэтыя лакацыі вядомыя і зразумелыя для жыхароў Мінска ў XVII ст., аднак для сучасных жыхароў горада і яго даследчыкаў вызначыць большасць з іх складана.

1. Гісторыя Мінска. — Мінск, 2006. — 696 с.
2. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 940-годдзя горада) : матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 7—9 верасня 2007 г.) / рэдкал. : А. А. Каваленя і інш. — Мінск : Беларуская навука, 2008. — 400 с.
3. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. Мінск, 4—5 верас. 2009 г. / Рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш]. — Мінск : Беларус. навука, 2010. — 220 с.
4. Мінск і мінчане : дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць: (да 945-годдзя Мінска): зб. навук. арт. / уклад. А. І. Груша; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.]. — Мінск : Беларус. навука, 2012. — 564 с.
5. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі : людзі, падзеі, час : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. А. А. Мяцельскі ; рэдкал. : В. Л. Лакіза (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2023. — 377 с.
6. Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі: да 955-годдзя горада : зб. навук. арт. / Нац. акад, навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. Р. А. Аляхновіч ; рэдкал. : В. Л. Лакіза [і інш]. — Мінск : Беларуская навука, 2023. — 545 с.
7. Стрэнкоўскі, С. Гарадское самакіраванне Мінска ў XVI—XVII стагоддзях / С. Стрэнкоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. — 2022. — № 3. — С. 8—18.
8. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. — Ф. 822. Воп. 11. Спр. 884 Г.
9. Боровой, Р. В. Планирование и застройка левобережной части исторического центра Минска в XIX — начале XX в. (по материалам архивных источников) / Р. В. Боровой // Архіварыус. — Вып. 10. — Мінск, 2012. — С. 132—146.
10. Сацукевіч, І. І. Тапаграфія і тапаніміка мінскага Замчышча і Траецкай гары ў канцы XVIII—XX ст. / І. І. Сацукевіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі. Крыніцы па гісторыі горада. Сацыяльныя структуры і паўсядзённасць: (да 945-годдзя Мінска) : зб. навук. арт. — Мінск, 2012. — С. 215—220.
11. Сацукевіч. І. Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. / І. І. Сацукевіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 2021. — № 2. — С. 11—18.
12. Сацукевіч, І. Назвы вуліц і плошчаў Мінска ў другой палове XIX — пачатку XX ст. / І. І. Сацукевіч // Беларускі гістарычны часопіс. — 2022. — № 3. — С. 29—35.
14. Сацукевіч, І. І. Назвы вуліц і плошчаў у міжваенны перыяд (1919—1940) / І. І. Сацукевіч // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 510-годдзя атрымання Менскам магдэбургскага права) : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 4—5 верасня 2009 г. — Мінск, 2010. — С. 176—181.
15. Сацукевіч, І. І. Назвы вуліц Мінска ў 1945—1985 гг. / І. І. Сацукевіч // Молодежь в науке — 2009: прил. к журн. "Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі". В 5 ч. — Ч. 2. Серия гуманитарных наук / редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.), В. В. Гниломедов [и др.]. — Минск, 2010. — С. 32—35.
16. Сацукевіч, І. І. Змены ў назвах мінскіх вуліц у 1986—2000 гг. / І. І. Сацукевіч // Памяць : гіст.-дакум. хроніка Мінска. У 5 кн. — Кн. 5-я. Ч. 2. — Мінск, 2007. — С. 151—153.
17. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 1.
18. НГАБ. — Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 54.
19. Палтаржыцкая, Н. М. Назвы вуліц і вулачак Менска ў актах магістрацкіх кніг 1663—1680 гг. / Н. М. Палтаржыцкая // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 955-годдзя горада) : зб. навук. арт. — Мінск, 2023. — С. 100—110.
20. НГАБ. — Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 2.
21. НГАБ. — Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 6.
22. НГАБ. — Ф. 1816. Воп. 1. Спр. 28.

*Паступіў у рэдакцыю 04.09.2024.*